# Раздзел II. БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У 1917–1945 гг.

## *§ 23–0. Тэндэнцыі гістарычнага развіцця ў 1917–1945 гг.

НАВЕЙШАЯ ГІСТОРЫЯ
ВЕРСАЛЬСКАЯ ДАМОВА
ПАРЫЖСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ
ВАШЫНГТОНСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ
ЛІГА НАЦЫЙ ГЛАБАЛІЗАЦЫЯ
НАЦЫЯНАЛІЗМ КАЛОНІЯ

Паняцце «Навейшая гісторыя»

**1. Навейшая гісторыя: перыядызацыя і змест.** *Навейшая гісторыя*, або *гісторыя Навейшага часу*, — гэта перыяд, які ахоплівае падзеі і працэсы ад Першай сусветнай вайны і расійскіх рэвалюцый 1917 г. да нашых дзён. Гэты перыяд характарызуецца значнымі палітычнымі, сацыяльнымі, эканамічнымі і культурнымі зменамі, якія аказалі ўплыў на ўсе сферы жыцця грамадства. Гісторыя Навейшага часу ўмоўна падзяляецца на некалькі перыядаў: міжваенны, Другая сусветная вайна, пасляваенны.

Навейшая гісторыя XXI ст. характарызуецца глабалізацыяй, што пачалася напрыканцы XX ст., развіццём інфармацыйных тэхналогій, абвастрэннем барацьбы паміж вядучымі дзяржавамі за ўсталяванне кантролю над энергетычнымі рэсурсамі планеты. Паўстаюць новыя сусветныя пагрозы (выклікі), такія як міжнародны тэрарызм, лакальныя войны, міграцыйныя крызісы, змяненне клімату і шмат іншых.




*Перыяды Навейшай гісторыі і іх змест*

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ




Славуты англійскі вучоны Э. Хабсбаум у сваёй кнізе «Эпоха крайнасцей. Кароткае дваццатае стагоддзе. 1914–1991» сцвярджаў: «Свет узору XX ст. зрабіўся якасна іншым. Ён больш не быў еўропацэнтрычны. Зямны шар ператварыўся ў адзіны рабочы арганізм, якім ён не быў, дый не мог быць раней. Для многіх мэт, асабліва эканамічных, базавай арганізацыйнай адзінкай цяпер фактычна з'яўляецца зямны шар, а ранейшыя структурныя адзінкі, такія як нацыянальныя эканомікі, зрабіліся ў тормазам для транснацыянальнай дзейнасці».

*1. Які працэс мае на ўвазе вучоны, апісваючы змены, што адбыліся ў XX ст.?*
*2. Як вы лічыце, якія фактары паспрыялі гэтым зменам?*
*3. Якія яшчэ глабальныя змены адбыліся ў XX ст.?*

**2. Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін: этапы і асаблівасці фарміравання, прынцыпы, супярэчнасці.** Пасля Першай сусветнай вайны ў 1919–1922 гг. была створана новая сістэма міжнародных адносін, якая атрымала назву **Версальска-Вашынгтонскай.** Яна фарміравалася ў два этапы: спачатку ў Еўропе на Парыжскай мірнай канферэнцыі, а пасля на Далёкім Усходзе і ў Ціхім акіяне на Вашынгтонскай канферэнцыі. Асновай сістэмы была Версальская мірная дамова з Германіяй, падпісаная 28 чэрвеня 1919 г. Дамова насіла карны характар: Германія абвяшчалася адзінай вінаватай у вайне, пазбаўлялася 13 % тэрыторыі і 10 % насельніцтва, а таксама ўсіх калоній. Яе армія абмяжоўвалася 100 тысячамі чалавек, забараняліся танкі, ваенная авіяцыя і падводныя лодкі. Германія абавязвалася выплаціць велізарныя рэпарацыі, першапачаткова ацэненыя ў 269 мільярдаў залатых марак, а пасля скарочаныя да 132 мільярдаў.

Апроч Версальскай дамовы былі падпісаныя пагадненні з іншымі краінамі-пераможцамі: Сен-Жэрменская дамова з Аўстрыяй, Нёйіская — з Балгарыяй, Трыянонская — з Венгрыяй, і Севрская — з Асманскай імперыяй. Гэтыя дамовы прывялі да распаду Аўстра-Венгерскай і Асманскай імперый і да стварэння на іх тэрыторыі новых дзяржаў:

**Этапы і асаблівасці фарміравання**

**Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін** — сусветны парадак, асновы якога былі закладзены Версальскай мірнай дамовай (1919–1920 гг.), дамовамі з саюзнікамі Германіі, пагадненнямі, заключанымі на Вашынгтонскай канферэнцыі 1921–1922 гг.

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

1. *Разгледзьце карыкатуру, прысвечаную вынікам Парыжскай мірнай канферэнцыі. Чаму Германія паказана ў выглядзе каня, якога пераважвае воз сена?*
2. *Што сімвалізуе воз сена? Каму ён прызначаўся?*
3. *Узнікненню якога глабальнага канфлікту паспрыяла сітуацыя, паказаная на карыкатуры? Свой адказ аргументуйце.*






## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Трыянонская дамова, у выніку якой Венгрыя страціла 72 % тэрыторыі і 64 % насельніцтва (у тым ліку 3 млн этнічных венграў), выхад да мора і флот, была ўспрынятая ў Славакіі і Румыніі як аднаўленне справядлівасці, а ў самой Венгрыі — як нацыянальная трагедыя. Папулярнасць атрымалі лозунгі «Не, не, ніколі!» (Nem, nem, soha!) і «Вярніце ўсё!» (Mindent vissza!).

З нагоды заключэння дамовы ў краіне была абвешчана нацыянальная жалоба. У розных месцах краіны былі збудаваныя «Трыянонскія помнікі», якія аплаквалі падзеленую Венгрыю.

1. *Як вы лічыце, да росту якіх настрояў у венгерскім грамадстве прывялі ўмовы Трыянонскай дамовы?*
2. *Як маглі складвацца адносіны Венгрыі з тымі краінамі, да якіх былі далучаны былыя венгерскія землі?*

Аўстрыі, Венгрыі, Чэхаславакіі, Югаславіі, Польшчы, Фінляндыі, Латвіі, Літвы і Эстоніі. Аднак новыя межы часцяком праводзіліся без уліку этнічнага складу насельніцтва, што стварала праблемы нацыянальных меншасцей і рабілася крыніцай будучых канфліктаў.

Вашынгтонская канферэнцыя 1921–1922 гг. дапоўніла еўрапейскую сістэму дамоў. На ёй былі заключаныя чатыры асноўныя пагадненні. Дамова чатырох дзяржаў (ЗША, Вялікабрытанія, Францыя, Японія) замяніла англа-японскі саюз і прадугледжвала шанаванне правоў на астраўныя ўладанні ў Ціхім акіяне. Дамова пяці дзяржаў усталявала суадносіны танажу лінейных караблёў і авіяносцаў, што замацавала парытэт ЗША і Вялікабрытаніі і абмяжавала ваенна-марскія магчымасці Японіі. Дамова дзевяці дзяржаў прызнавала суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць Кітая і замацоўвала прынцыпы «адчыненых дзвярэй» і «роўных магчымасцей» для ўсіх дзяржаў у гандлі з Кітаем, што было выгадна для ЗША.

**Прынцыпы Версальска-Вашынгтонскай сістэмы**

Сістэма грунтавалася на некалькіх прынцыпах, але ўжывала іх выбіральна. Прынцып самавызначэння нацый рэалізоўваўся ў Еўропе, але не пашыраўся на каланіяльныя народы. Прынцып калектыўнай бяспекі павінен быў забяспечвацца праз Лігу Нацый, але гэтая арганізацыя не мела ўласных узброеных сіл. Прынцып адказнасці за вайну і выплаты рэпарацый спараджаў пачуццё несправядлівасці ў Германіі. Прынцыпы свабоды мораў і роўных магчымасцей адлюстроўвалі інтарэсы ЗША, але падрывалі каланіяльныя манаполіі еўрапейскіх дзяржаў.

**Супярэчнасці Версальска-Вашынгтонскай сістэмы**

Версальска-Вашынгтонская сістэма была няўстойлівая, таму што мела глыбокія супярэчнасці. Галоўнай была супярэчнасць паміж пераможцамі і пераможанымі: умовы дамоў, асабліва Версальскай, успрымаліся ў Германіі як нацыянальнае прыніжэнне, што выклікала рэваншысцкія настроі.

Унутры лагера пераможцаў існавалі спрэчкі: Францыя імкнулася да максімальнага аслаблення Германіі, Вялікабрытанія — да балансу сіл, ЗША — да эканамічнай экспансіі. Італія і Японія былі незадаволеныя вынікамі, што паспрыяла прыходу да ўлады фашысцкіх рэжымаў. Тэрытарыяльныя спрэчкі паміж новымі дзяржавамі, выключэнне СССР з сістэмы і захаванне каланіяльных імперый таксама аслаблялі яе. Спробы ўмацаваць сістэму, такія як Лакарнскія дамовы 1925 г. і пакт Брыяна — Келага 1928 г., аказаліся недастатковымі для прадухілення крызісу.

**3. Стварэнне Лігі Нацый.** Ліга Нацый была створана з ініцыятывы прэзідэнта ЗША Вудра Вільсана. Статут Лігі зрабіўся першай часткай Версальскай дамовы, і арганізацыя пачала сваю дзейнасць 10 студзеня 1920 г. Штаб-кватэра Лігі размяшчалася ў Жэневе. У розны час яе членамі былі 63 дзяржавы, але ЗША так і не ўступілі ў яе, таму што Сенат адмовіўся ратыфікаваць Версальскую дамову, што істотна аслабіла арганізацыю.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З Прэамбулы Статута Лігі Нацый ад 10 студзеня 1920 г.**

Высокія Дагаворныя Бакі, беручы пад увагу, што для развіцця супрацоўніцтва паміж народамі і для гарантыі іх міру і бяспекі важна прыняць пэўныя абавязкі не распачынаць вайну, падтрымліваць у поўнай галоснасці міжнародныя адносіны, заснаваныя на справядлівасці і сумленні, дакладна выконваць прадпісанні міжнароднага права, якія ад цяпер прызнаюцца за сапраўднае правіла паводзін урадаў, усталяваць панаванне справядлівасці і добрасумленна выконваць усе абавязкі, што накладаюцца дамовамі, ва ўзаемных адносінах арганізаваных народаў, што прымаюць сапраўдны Статут, які засноўвае Лігу Нацый.

1. *З якой мэтай стваралася міжнародная арганізацыя Ліга Нацый? Якія задачы яна мела вырашаць?*
2. *Як вы лічыце, ці выканала Ліга Нацый ускладзеныя на яе задачы? Сваю думку аргументуйце.*

### Структура і функцыі Лігі Нацый

Структура Лігі ўключала Асамблею, у якой былі прадстаўленыя ўсе члены, і Савет, які складаўся з пастаянных і непастаянных членаў. Пастаяннымі членамі былі Вялікабрытанія, Францыя, Італія і Японія. У 1926 г. да іх далучылася Германія, а ў 1934 г. — СССР. Пры Лізе дзейнічаў Пастаянны сакратарыят і Пастаянная палата міжнароднага правасуддзя ў Гаазе. Ліга выконвала шырокі спектр функцый: прадухіленне войнаў, кантроль за мандатнай сістэмай, рэгуляванне гандлю зброяй і наркотыкамі, кантроль за ўзбраеннямі, паляпшэнне ўмоў працы праз Міжнародную арганізацыю працы, дапамога бежанцам і барацьба супраць рабства.

### Ліга Нацый у 1920-я гг.

У 1920-я гг. Ліга дасягнула некаторых поспехаў: яна дапамагла ўрэгуляваць спрэчкі паміж Швецыяй і Фінляндыяй наконт Аландскіх астравоў, паміж Польшчай і Літвой наконт Вільні, паміж

Грэцыяй і Італіяй наконт вострава Корфу. Ліга арганізавала фінансавую дапамогу Аўстрыі і Венгрыі, праводзіла плебісцыты на спрэчных тэрыторыях і кантралявала кіраванне Данцыгам і Саарскай вобласцю. Камісія па справах бежанцаў пад кіраўніцтвам Фрыцьёфа Нансена дапамагла вярнуцца дадому сотням тысяч былых ваеннапалонных і зацвердзіла пашпарт Нансена для асоб без грамадзянства.

Ліга Нацый у 1930-я гг.

Аднак у 1930-я гг. Ліга сутыкнулася з сур'ёзнымі выклікамі і прадэманстравала сваю неэфектыўнасць. У 1931 г. Японія захапіла Маньчжурыю, а ў 1933 г. выйшла з Лігі, праігнараваўшы яе рашэнне. У 1933 г. з Лігі выйшла Германія і пачала адкрытае пераўзбраенне. У 1935 г. Італія напала на Эфіопію, і, нягледзячы на прызнанне яе агрэсарам і ўвядзенне эканамічных санкцый, Ліга не здолела спыніць акупацыю. У 1936 г. Германія ўвяла войскі ў дэмілітарызаваную Рэйнскую зону, а ў 1938 г. ажыццявіла аншлюс Аўстрыі і захоп Судэцкай вобласці Чэхаславакіі. У 1939 г. Ліга выключыла СССР за напад на Фінляндыю, але не абмяркоўвала германскую агрэсію супраць Польшчы. Да 1940 г. дзейнасць Лігі фактычна спынілася, і 18 красавіка 1946 г. яна была афіцыйна скасаваная, а яе функцыі перададзены Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

**4. Геапалітычнае значэнне стварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (далей — СССР).** *Стварэнне СССР* у **1922 г.** зрабілася знакавай падзеяй. Аб'яднанне савецкіх рэспублік у адну дзяржаву, заснаваную на ідэях сацыялізму і пралетарскай рэвалюцыі, змяніла палітычную карціну свету.

СССР зрабіўся першай у гісторыі краінай, дзе была абвешчана ўлада рабочага класа і сялянства. Гэта прыцягнула ўвагу ўсяго свету — як прыхільнікаў, так і праціўнікаў сацыялістычных ідэй. Заходнія дзяржавы апасаліся пашырэння камунізму

Чаму Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін спрыяла росту аўтарытарных рэжымаў і рэваншысцкіх настрояў?

і пачалі фарміраваць антыкамуністычныя альянсы, што спрыяла ўзнікненню напружанасці ў міжнародных адносінах.

**Змяненне балансу сіл у Еўропе і Азіі**

Савецкая дзяржава валодала велізарнай тэрыторыяй, якая ўключала Сібір і Сярэднюю Азію, мела доступ да багатых рэсурсаў і стратэгічных шляхоў. Такое становішча дазволіла ёй ператварыцца ў важнага гульца на сусветнай арэне, здольнага ўплываць на эканоміку і палітыку іншых краін.




*Плакат «Няхай жыве Камінтэрн!»*

СССР актыўна распаўсюджваў камуністычныя ідэалы за межамі сваёй тэрыторыі, падтрымліваў рэвалюцыйныя рухі і партыі ў краінах Еўропы, Азіі і Лацінскай Амерыкі. Інструментам гэтай палітыкі выступіў Камінтэрн *(Камуністычны Інтэрнацыянал)* — міжнародная арганізацыя, што аб'ядноўвала камуністычныя партыі розных краін у 1919–1943 гг. Яна спрыяла таму, што ўплыў Савецкага Саюза пашыраўся, а гэта выклікала трывогу ў заходніх дзяржаў. Вызначальны ўнёсак СССР у перамогу над нацысцкай Германіяй і яе саюзнікамі яшчэ больш умацаваў яго пазіцыі на міжнароднай арэне ў другой палове XX ст.

**Актывізацыя нацыянальна-вызваленчага руху**

Пасля Другой сусветнай вайны СССР быў важным фактарам дэкаланізацыі і распаду каланіяльнай сістэмы. Падтрымліваючы незалежнасць вызваленых краін, ён такім чынам умацоўваў свае пазіцыі ў Азіі і Афрыцы, змяняючы глабальны баланс сіл на карысць сацыялістычнага лагера.

**4. Нацыяналізм і мілітарызм у Еўропе і свеце.** *Нацыяналізм* і **мілітарызм** у Еўропе і свеце ў 1920–1930-я гг. ператварыліся ў важныя фактары, якія вызначылі палітычную атмасферу таго часу і падрыхтавалі глебу для глабальных канфліктаў, у тым ліку Другой сусветнай вайны. Гэтыя з'явы паўсталі на фоне эканамічных, сацыяльных і палітычных змяненняў, выкліканых Першай сусветнай вайной і яе наступствамі.

**Мілітарызм** — ідэалогія і палітыка актыўнага нарошчвання і выкарыстання ваеннай магутнасці дзяржавы; дамінаванне ваенных у дзяржаўным і грамадскім жыцці.

Пасля заканчэння вайны многія краіны сутыкнуліся з эканамічнымі цяжкасцямі, сацыяльнымі хваляваннямі і палітычнай нестабільнасцю. Ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу 1929–1933 гг. нацыяналістычныя настроі ўзмацніліся, бо людзі шукалі самыя простыя тлумачэнні для сваіх бедстваў. Нацыяналізм зрабіўся ідэалогіяй, якая аб'ядноўвала людзей вакол нацыянальнай культуры і гісторыі. Ён нярэдка выкарыстоўваўся для апраўдання агрэсіўнай знешняй палітыкі і экспансіі.

**Узмацненне нацыяналістычных настрояў**

Успомніце, што такое нацыяналізм.

У сваёй крайняй, адкрыта варожай у дачыненні да іншых народаў форме нацыяналізм зрабіўся найважнейшай часткай ідэалогіі такіх палітычных плыняў, што ўзніклі пасля Першай сусветнай вайны ў Еўропе, як ***фашызм*** і нацыянал-сацыялізм, або **нацызм.** Фашысты і нацысты абвяшчалі сябе адзінай палітычнай сілай, якая адлюстроўвае інтарэсы нацыі. Яны ставілі сабе за мэту дабіцца яе адзінства. Інтарэсы асобнага чалавека падпарадкоўваліся інтарэсам нацыі. Дзяржава, якую меркавалі пабудаваць фашысты і нацысты, разглядалася імі як галоўны абаронца нацыянальных інтарэсаў. Дзеля гэтага яна павінна была ўсталяваць поўны кантроль над грамадствам, кожным чалавекам, падаўляць усякае іншадумства, таму што разнастайнасць меркаванняў падрывае адзінства нацыі. Найважнейшай адметнай рысай нацызму было тое, што ў аснове яго ідэалогіі ляжала «расавая тэорыя». Яе асновай з'яўляецца міф аб абранасці «найвышэйшай арыйскай расы», яе вяршэнства над іншымі народамі.

**Нацызм** — разнавіднасць фашызму, адна з формаў таталітарнага рэжыму, якая характарызуецца расізмам, антысемітызмам, масавым тэрорам.

Найважнейшым элементам ідэалогіі і палітыкі фашыстаў і нацыстаў быў мілітарызм. Нацысцкая партыя, якую ўзначальваў А. Гітлер, акцэнтавала ўвагу на прыніжэнні, якое Германія зазнала пасля Версальскай дамовы, і заклікала да рэваншу за паражэнне ў Першай сусветнай вайне. Новая вайна мусіла прывесці да ўсталявання сусветнага панавання «арыйскай расы». У Італіі фашысцкі рэжым на



*Бітва пры Адуа. Невядомы мастак. 1896 г.*

чале з Б. Мусаліні апеляваў да былой велічы Рымскай імперыі, аднавіць якую ён імкнуўся. Паколькі дасягнуць гэтых мэт было магчыма толькі шляхам агрэсіўнай вайны, нацысцкая Германія і фашысцкая Італія да яе актыўна рыхтаваліся. Яны пераводзілі эканоміку на вытворчасць узбраенняў, нарошчвалі моц сваіх армій. У 1935 г. італьянская армія была накіраваная на заваяванне Эфіопіі. Гэта быў адзін з першых ваенных канфліктаў напярэдадні Другой сусветнай вайны.

## Грамадзянская вайна ў Іспаніі

Новы ачаг сусветнай вайны палыхнуў у Іспаніі. У 1936–1939 гг. у краіне выбухнула грамадзянская вайна, якая сталася адлюстраваннем ідэалагічнага супрацьстаяння і маштабнага ўмяшання замежных дзяржаў. Рэспубліканцы, што баранілі дэмакратычныя і сацыялістычныя ідэалы, сутыкнуліся з франкістамі, якія імкнуліся да ўсталявання аўтарытарнага рэжыму. На ход вайны значны ўплыў аказалі знешнія сілы. СССР падтрымліваў рэспубліканцаў, пастаўляў ім зброю і добраахвотнікаў. На баку Франсіска Франка дзейнічалі нацысцкая Германія і фашысцкая Італія, якія адправілі авіяцыю і войскі. Вайна скончылася перамогай Франка, што прывяло да ўсталявання ў Іспаніі дыктатуры.

**Мілітарызм у Японіі**

У 1930-я гг. мілітарызм лёг у аснову афіцыйнай ідэалогіі ў Японіі, дзе ваенная сіла прапагандавалася як сродак вырашэння ўнутраных і знешніх праблем. Гэтая ідэя была пакладзена ў аснову канцэпцыі «вялікай Японіі», якая прадугледжвала стварэнне магутнай дзяржавы, што аб'яднала б народы Усходняй Азіі пад японскім панаваннем. Краіна павялічыла ваенныя выдаткі, мадэрнізавала армію і флот, стварыла магутную ваенную машыну. Арыентацыя Японіі на тэрытарыяльную экспансію прывяла да ўварвання яе ўзброеных сіл у Маньчжурыю ў 1931 г., а пасля і да поўнамаштабнай вайны з Кітаем (1937–1945 гг.). Так у свеце ўзнік яшчэ адзін ачаг вайны.



*Берагавыя стралковыя часці ВМС Імператарскай Японіі ў Кітаі*

Міжнародная супольнасць не здолела адэкватна адрэагаваць на рост уплыву нацыяналізму і мілітарызму. Ліга Нацый, створаная для падтрымання міру і бяспекі, аказалася неэфектыўнай у прадухіленні агрэсіўных дзеянняў дзяржаў. Гэта стварыла атмасферу беспакаранасці, якая паспрыяла далейшаму росту нацыяналістычных і мілітарысцкіх настрояў.

**Прычыны Другой сусветнай вайны**

**6. Другая сусветная вайна як геапалітычны канфлікт.** Другая сусветная вайна была заканамерным вынікам крызісу Версальска-Вашынгтонскай сістэмы і паглыблення супярэчнасцей паміж вялікімі дзяржавамі. Галоўнай прычынай вайны выступіў курс Германіі на рэванш за паражэнне ў Першай сусветнай вайне. Прыход да ўлады нацыянал-сацыялістаў на чале з Адольфам Гітлерам у 1933 г. адзначыў пачатак агрэсіўнай палітыкі, заснаванай на расавай тэорыі і імкненні да стварэння «жыццёвай прасторы» на Усходзе. Эканамічны крызіс 1929–1933 гг. — Вялікая дэпрэсія — узмацніў сацыяльную напружанасць і паспрыяў прыходу да ўлады фашысцкіх рэжымаў у Італіі і Германіі.

Італія пад кіраўніцтвам Беніта Мусаліні імкнулася да ўсталявання панавання ў Міжземнамор'і і да стварэння новай Рымскай імперыі. Агрэсія супраць Эфіопіі ў 1935–1936 гг. была праявай гэтай палітыкі.

Японія, сутыкнуўшыся з нястачай рэсурсаў, узяла курс на стварэнне «Сферы супольнага квітнення Вялікай Усходняй Азіі» пад сваім кантролем, захапіўшы Маньчжурыю ў 1931 г. і распачаўшы поўнамаштабную вайну супраць Кітая ў 1937 г.

**Палітыка замірэння**

Найважнейшым фактарам, які паспрыяў пачатку вайны, была палітыка замірэння, якую праводзілі Вялікабрытанія і Францыя. Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Невіл Чэмберлен імкнуўся пазбегнуць новай вайны любым чынам і ішоў на саступкі агрэсарам. Кульмінацыяй гэтай палітыкі зрабілася Мюнхенскае пагадненне верасня 1938 г., калі Вялікабрытанія і Францыя фактычна аддалі Гітлеру Судэцкую вобласць Чэхаславакіі, здрадзіўшы свайму саюзніку. Разрозненасць патэнцыйных праціўнікаў агрэсіі таксама спрыяла пачатку вайны. Перамовы паміж СССР, Вялікабрытаніяй і Францыяй наконт стварэння антыгерманскага блока летам 1939 г. скончыліся безвынікова. У гэтых умовах СССР і Германія заключылі 23 жніўня 1939 г. Пакт аб ненападзе з сакрэтным пратаколам аб падзеле сфер уплыву ва Усходняй Еўропе, што дазволіла Гітлеру пазбегнуць вайны на два франты пасля нападу на Польшчу 1 верасня 1939 г.

**Сутыкненне розных геапалітычных праектаў**

Вайна была сутыкненнем розных геапалітычных праектаў. Германія імкнулася да ўсталявання сваёй гегемоніі ў Еўропе, знішчэння СССР і стварэння «новага парадку» з панаваннем «арыйскай расы». Італія ставіла сваёй мэтай усталяванне кантролю над Міжземнамор'ем і стварэнне новай Рымскай імперыі. Японія імкнулася да панавання ў Азіі і на Ціхім акіяне. Вялікабрытанія і Францыя пачаткова намагаліся захаваць статус-кво і абараніць сваю незалежнасць. СССР пасля нападу Германіі 22 чэрвеня 1941 г. вёў вайну за сваё выжыванне. ЗША, уступіўшы ў вайну пасля нападу Японіі на Пёрл-Харбар 7 снежня 1941 г., мелі мэтай знішчэнне агрэсіўных рэжымаў і зацвярджэнне свайго лідарства ў пасля-

ваенным свеце. Вайна была глабальным геапалітычным канфліктам за перадзел свету, які прывёў да краху Версальска-Вашынгтонскай сістэмы і стварэння новага сусветнага парадку.

**7. Краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў міжваенны перыяд.** У міжваенны перыяд краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі зазналі вялікія змены, абумоўленыя наступствамі Першай сусветнай вайны, каланіяльнай залежнасцю і ўнутранымі сацыяльна-эканамічнымі праблемамі. Гэты перыяд характарызуецца ўзмацненнем нацыянальна-вызваленчых рухаў, барацьбой за незалежнасць і спробамі мадэрнізацыі.

Кітай

У Кітаі пасля зварження манархіі ў 1912 г. ішла жорсткая барацьба за ўладу паміж рознымі палітычнымі сіламі, перш за ўсё Гаміньданам і Камуністычнай партыяй Кітая (КПК). Грамадзянская вайна, што пачалася ў сярэдзіне 1920-х гг., фактычна скончылася толькі ў 1949 г.

Індыя

У Індыі ў гэты ж час актыўна развіваўся нацыянальна-вызваленчы рух супраць брытанскага каланіяльнага праўлення. Лідары Нацыянальнага кангрэса пад кіраўніцтвам Махатмы Гандзі ўжывалі тактыку негвалтоўнасці і грамадзянскага непадпарадкавання ў барацьбе з каланіяльнымі ўладамі.



*М. Гандзі*



*М. К. Атацюрк*

Гэтая новая стратэгія прывяла да поспеху пасля Другой сусветнай вайны.

Турцыя

Значныя змены адбыліся на Блізкім Усходзе. Пасля распаду Асманскай імперыі ўзніклі новыя дзяржавы. Турцыя пад кіраўніцтвам Мустафы Кемаля Атацюрка здабыла незалежнасць ва ўпартай барацьбе з інтэрвентамі і правяла маштабныя рэформы па стварэнні свецкай дзяржавы і мадэрнізацыі грамадства. Арабскія краіны, што раней уваходзілі ў склад Асманскай імперыі, апынуліся пад каланіяльным кіраваннем Вялікабрытаніі і Францыі па мандаце Лігі Нацый.

Лацінская Амерыка

Лацінская Амерыка ў міжваенны перыяд сутыкнулася з эканамічнымі крызісамі і палітычнай нестабільнасцю. Краіны рэгіёна імкнуліся дыверсіфікаваць свае эканомікі і паменшыць залежнасць ад экспарту сыравіны. У шэрагу краін, такіх як Аргенціна і Бразілія, утварыліся аўтарытарныя рэжымы, якія намагаліся стабілізаваць сітуацыю шляхам мілітарызацыі і ўзмацнення кантролю над грамадствам.

Афрыка

У Афрыцы ў гэты перыяд працягваўся каланіяльны кантроль з боку еўрапейскіх дзяржаў, такіх як Вялікабрытанія, Францыя, Бельгія і Партугалія. Пасля Першай сусветнай вайны былыя германскія калоніі перайшлі пад кантроль краін, якія перамаглі. Мясцовыя жыхары цярпелі эканамічную эксплуатацыю і палітычнае бяспраўе. Калоніі былі аграрнасыравіннымі прыдаткамі еўрапейскіх дзяржаў. Каланіялізм разбураў традыцыйнае грамадства і змяняў лад жыцця. У міжваенны перыяд ён трывала замацаваўся на поўдзень ад Сахары.

Сітуацыя ў арабскай Паўночнай Афрыцы была іншая. Тут вызваленчая барацьба дасягнула заўважных вынікаў: у 1920-х гг. мараканцы выступілі супраць французаў і іспанцаў, стварыўшы на кароткі час незалежную рэспубліку. У 1922 г. Егіпет здабыў фармальную незалежнасць пасля двух антыбрытанскіх паўстанняў.

*Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін абумовілі з'яўленне супярэчнасцей паміж пераможцамі і пераможанымі. Зневажальныя ўмовы мірных дагавораў, навязаных пераможаным краінам, зрабіліся найважнейшай крыніцай рэваншызму і мілітарызму. Гэта былі ўзаемазвязаныя з'явы, якія ўзмацнялі адна адну і стваралі перадумовы для новага глабальнага канфлікту. Эканамічныя цяжкасці, палітычная нестабільнасць і сацыяльныя хваляванні спрыялі росту гэтых ідэалогій, што ў выніку прывяло да катастрафічных наступстваў ва ўсім свеце.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
| --- | --- |
| 1919 г. — Версальская мірная дамова з Германіяй | 1918 г. — Брэсцкі мірны дагавор |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Дайце вызначэнне тэрміну «Навейшая гісторыя». Назавіце яе перыяды. Вызначце тры гістарычныя факты (падзеі, з'явы або працэсы), найбольш значныя для кожнага перыяду Навейшай гісторыі. Свой выбар растлумачце.
2. Ахарактарызуйце Версальска-Вашынгтонскую сістэму міжнародных адносін. У чым заключалася яе супярэчлівасць?
3. Вызначце прычыны стварэння Лігі Нацый. Ахарактарызуйце асноўныя вынікі яе дзейнасці. Чаму Ліга Нацый не здолела ўратаваць свет ад Другой сусветнай вайны?
4. Ці згодныя вы са сцвярджэннем: «Утварэнне СССР мела значэнне для ўсёй сусветнай гісторыі»? Сваю думку аргументуйце.
5. Чаму міжваенны перыяд зрабіўся часам росквіту ідэалогій нацыяналізму і мілітарызму, фашызму?
6. Вызначце фактары, якія спрыялі распачынанню Другой сусветнай вайны. Дакажыце, што Другая сусветная вайна з'яўляецца геапалітычным канфліктам.
7. Вылучыце асноўныя тэндэнцыі ў развіцці краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў міжваенны перыяд. Канкрэтызуйце іх фактамі.